

Бібліятэка Старога Гораду

У 525-ыя ўгодкі в.Альпень Столінскага раёну

Альпенскі дыялектны слоўнік

ВЫКАЗВАЕМ ШЧЫРУЮ ПАДЗЯКУ
канд. філалагічных навук
ЕМЕЛЬЯНОВІЧ Веры Міхайлаўне,
дацэнту кафедры гісторыі беларускай
мовы і дыялекталогіі
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэту імя А.Пушкіна,
за парады і дапамогу ў падрыхтоўцы
слоўніка да друку

Берасьцейская гарадская Рада
ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны»
Берасьцейскае аддзяленне МГА «Гісторыка»

Іван ЛЯШКЕВІЧ

Альпенскі дыялектны слоўнік

Альпень-Берасьце
2004

ББК 81.411.3-5
Л99

Б і б л і я т э к а
СТАРОГА ГОРАДУ

Серыя 2. ПАЛЕСКІ КУФЭРАК, 1.

Заснавана ў 2004 годзе
ГА «Стары горад», Берасьцейскай гарадской Радай
ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны»
і Берасьцейскім аддзяленнем МГА «Гісторыка»

Ляшкевіч І.Ул.

Л99 Альпенскі дыялектны слоўнік.— Альпень-Берасьце, 2004.— 36 с. — (*Бібліятэка Старога Гораду: Палескі куфэрак, 1*).

Гэты дыялектны слоўнік – спроба захавання моўных скарбаў народу, часцінкай якога з'яўляюцца і жыхары в. Альпень, што на Століншчыне. У ім змешчана каля 375 словаў. Будзе цікавы настаўнікам, вучням, краязнаўцам і ўсім, хто любіць і шануе роднае слова, свой край, сваю малую Радзіму.

Альпенскі дыялектны слоўнік

Гэты слоўнік – першая спроба захавання моўных скарбаў народу, часцінкай якога з'яўляюцца і жыхары в. Альпень, што на Століншчыне. У яго ўвайшлі дыялектныя словы, якія, як правіла, значна альбо вельмі значна адрозніваюцца ад агульнапрынятых літаратурных. Не ўключаны ў слоўнік словы, якія ад беларускіх літаратурных адрозніваюцца вельмі мала. Напрыклад, не ўвайшлі ў слоўнік дзеясловы, неазначальная форма якіх у беларускай мове заканчваецца на *-ць*, а ў альпенскай гаворцы на *-ть*. Гэта словы тыпу *шукаць – шукать, рабіць – робіть, насіць – носіць* і г. д. Для альпенскай гаворкі характэрна оканне, а не аканне. Такія словы таксама ў слоўніку не прыводзяцца, таму што ў такім выпадку слоўнік быў бы вялікі памерам, але мала адрозніваўся б ад слоўніка літаратурнай беларускай мовы. Напрыклад, няма слоў тыпу *карова – корова, галава – голова і* т.п.

Дзеясловы пададзены ў неазначальнай форме, назоўнікі – у назоўным склоне адзіночнага ліку.

Усе словы ілюструюцца прыкладамі з мясцовай гаворкі.

Слоўнік складзены на базе картатэкі слоў, што сабралі вучні 7-9 класаў Альпенскай няпоўнай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам настаўніка школы Івана Ляшкевіча.

Работа гэтая зроблена з мэтай адраджэння цікавасці да роднай мовы, з надзеяй, што яна будзе патрэбная настаўнікам, вучням, краязнаўцам і ўсім, хто любіць і шануе роднае слова, свой край, сваю малую Радзіму.

І. Ул. ЛЯШКЕВІЧ
настаўнік Альпенскай БШ

Прынятыя скарачэнні:

абразл. – абразлівае
выкл. — выклічнік
груб. – грубае
ж. – жаночы род
займ. – займеннік
зак. – закончанае трыванне
зб. – зборны назоўнік
зневаж. – зневажальнае
лаянк. – лаянкавае
м. – мужчынскі род
мн. – множны лік
н. – ніякі род
незадав. – незадавальняльнае
незак. – незакончанае трыванне
пагард. – пагардлівае
пераносн. – пераноснае значэнне
прым. – прыметнік
прыназ. – прыназоўнік
прысл. – прыслоўе
часц. – часціца
экспр. – экспрэсіўнае

А

А́ЙСТРА *ж.* Астра. *Айстры разным цветом тьвітуть.*

АЛЕ́БРА *часц.* Так, але. *Алебра, ты праўду казаў.*

АЛО́Х *м.* Капут, канец. *Думаў, алох буде тому сену, шчо день дождж.*

АЛЮ́ШКІ АЛЮ́Ш *выкл.* Вокліч, якім паганяюць кароў. *Алюшкі на пашу, рабка!*

АТ СОБЕ́ *выкл.* Ат сабе. *Бульба ат собе ў прошлом году ў мане была.*

Б

БА́БА *ж.* **1.** Старая жанчына, бабуля. *У Ольпэні самые бабы.* **2.** *перан.* Бязвольны мужчына. *Вон у ее худжэй бабы.*

БАБЗНО́ *н., зневаж.* Няўклюдная, грубая жанчына. *Та рублянка гэ некэ бабзно нехорэмнэ.*

БА́БКА *ж.* **1.** Камякі з тоўчанай бульбы. *Тая бабка ўжэ ў ее околела на столе стоя.* **2.** Бабка для кляпання касы. *Е бабкі гострые і плоскіе.* **3.** Грыб. *Я тых бабок грыбоў не знаю дайжэ.* **4.** *памянш.* ад бабуля. *Ты не спіш, бабко?*

БА́БОЧКА *ж.* **1.** Матылёк. *Нейкіх бабочок у хату налетело морэ.* **2.** *памянш.* ад бабуля. *Вона бабочка така нека чыста, культурна.*

БАГУ́К *м.* Свіны страўнік, начынены мясам з прыправамі. *Я з'ела багука за тыжджэнь.*

БАЙСТРУ́К *м.* Незаконна народжаны. *Байструк – гэто не ганьба.*

БАЛА́ГАН *м.* Непарадак, шум, вэрхал. *Шо то за балаган деті ўстроілі там, іді глянь!*

БА́ЛО *прысл.* Бывала. *Колісь мы, бало, тожэ чоўплі дурніцу разну, а на детей тепэр крычымо.*

БАРАМЭ́Т *м.* Барометр. *Як твой барамэт, на погоду чы не?*

БАРЭ́МОК *м.* Бярэмак. *Кінь сена там корові барэмок.*

БАСТЫ́ДНЫ *прым.* Бессаромны. *Деті слухають, а вон ляпае абы шчо, бастыдны.*

БА́ХАТЬ *зак.* Спаць *(у размове з дзецьмі)*. *Діма, ході бахать ужэ.*

БОБ *м.* Фасоля. *Я бобу цэлы машок напахала.*

БОЛВАНЕ́ТЬ *незак.* Невыразна бачыцца. *А быў досвіток. І бачу я – шчо-то болванее, чы чоловек, чы худобіна?*

БОЎКУ́Н *м.* Драўляны звон для скаціны, каб адшукваць яе па гуку. *По корчах короў паслі з боўкунамі.*

БОЎТУ́Н *м.* Ненайгранае яйка, што сапсавалася пры наседжванні. *Некі певэнь негодяшчы ў мане, почті ўсе яйца боўтуны былі.*

БУЛЕ́КА *ж.* Няўмека. *Вона така булека!*

БУ́МКАЛО *н.* Дзіцячая гульня, груз на доўгай нітцы, якім ударалі па акну. *Хлопцы увэчары ходять да бумкала робять.*

БУ́РКАЛО *н.* **1.** Адна з костачак у свінячай назе. *Седеў на пачэ да граў з буркалом.* **2.** Варкатлівы чалавек. *Мой стары такэ буркало, такі надоедны.*

БУ́РКІ *зб.* Від валёнак. *Я буркі подшыў рамэнем.*

БУ́СЬКО *м.* Бусел. *Бусько прылетеў, на буська захолодало.*

БУ́СЯТЬ *незак.* Цалаваць *(у размове з дзецьмі)*. *Дай побусяю Дімку, да пойде бахать хлопчык хорошы.*

БЭЗУГА́ВУ *прысл.* Бесперапынна. *Шчо ты мне бэзугаву тэ самэ тоўчыш?*

БЭ́ЛЕНЬ *ж.* Вельмі горкая расліна, відаць, палын. *Сматана горка бы бэлень, не можна есті.*

БЭ́РДО *н.* Бёрда. *Деті прышлі до мане, да бэрдо ім дала, воны старыну ў школу збірають.*

В

ВАДРО́ *н.* Вядро. *З пустым вадром дорогу парайшла.*

ВАЖКІ́ *прым.* Цяжкі. *Некі важкі хлеб, мо сыры, ті шчо.*

ВАЛІДУ́ЗНЫ *прым.* Надзвычай вялікі, велічэзны. *За Турскім е лесок такі, там быў лагер колісь, от там валідузные вужэ мы бачылі.*

ВАЛІ́ЗНЫ *прым.* Вялізны. *Над ракой дубы валізные рослі, шчэ мо послі войны воны былі.*

ВАЛІ́КО́ННЕ *н.* Вялікдзень, Пасха. *Парад Валіконнем яйца красять.*

ВАЛІ́СКА *ж.* Чамадан. *Раньшэ валіскі звалі, а тепэр чумайдан.*

ВАРАШЧА́КА *ж.* Верашчака. *Варашчаку з мукі робілі, зажарвалі салом, мясо крышылі, варылі ўсе.*

ВАРХОВО́Д *м.* Від рыбы. *Варховодоў ловілі да на жыўца хавалі ў банку з водою.*

ВА́ЎКА *ж.* Нарыў, загнаенне. *У Юры Галаёвого ваўка ўжэ заговілас.*

ВІД *м.* Твар. *Увэсь від у са́жы, а вона, смехоўе цэлэ, у магазін прыбегла.*

ВІЛЬГО́ТА *ж.* Ільгота. *У магазін прыйді, то ўсе кажуть, шо ім вільгота, да ніхто ў очарадi не стоiть.*

ВОЛО́КА *ж.* Валока, абора для лапцей. *Волокамі постолы к нозе крутілі.*

ВОЛО́ШНЯ МАЖА́ *ж.* Грань паміж суседнімі палямі, загонамі. *Волошня мажа пустовала, гэто граніца.*

ВОРОТІ́ЛО *н.* **1.** Дэталь кроснаў. *На воротіло полотно намотвалі.* **2.** Непаваротны, малярухомы чалавек. *Вон бы воротіло быў, але здоровы быў, ек конь.*

ВОРО́ЎКА *ж.* Вяроўка. *Ольпенцоў дражнять іншы раз машок-вороўка, бо так говорым.*

ВОСТО́ЧНІК *м.* Чалавек з Усходняй Беларусі альбо з Расіі. *Послі войны восточнікоў багато было.*

ВОШО́Л *м.* **1.** Гусіная вош. *Вошол на чоловеку не держыцца, бегае, бегае, да ўтекае.* **2.** *зневаж.* Нікчэмны чалавек. *Вон ек п'яны, то вошоламі ўсех бзывае, той Рысь.*

ВЎТВА *ж.* Качка. *Семанкового Мішы вутвы ў Золотцы годуюцца, любота ім.*

ВУЖЫ́ШЧЭ *н.* Кусок вяроўкі. *Дрова з воза россыпаліс, добрэ шчо вужышчэ некэ было с собою, да звезаў.*

ВЫДЕ́ЛВАЦЦА *незак.* Задавацца. *Не выделваецца нехай Коля, зразу хай поступіть.*

ВЫ́ДРА *ж. перан.* Непрыгожая, неахайная жанчына, дзяўчынка. *Ее дочка так нека выдра.*

ВЫКАБЭ́ЛЬВАЦЦА *незак.* Задавацца. *Выкабэльваецца, по-рускі говорыть стараецца, да не ўмее.*

ВЫ́ЛІВОК *м.* **1.** Яйка без шкарлупы. *Некотра кура ў нас выліўкі губіть.* **2.** Вельмі слабы, хілы. *Слабы ее хлопэц, вылівок некі.*

ВЫ́СКОРОК *м.* Кавалачак смажанага сала. *Ек узяў выскорка, то не ўмочай.*

ВЫ́ХВОТЕНЬ *м.* Скавароднік з жытняга цеста для хлеба. *Зразу спаку выхвотня детям, а далей хлеб саджаю ўжэ.*

ВЫ́ШКІ *зб.* Гарышча. *Я багука на вышках хаваю, подвешваю да кроквы.*

ВЫ́ШЧАРКА *ж.* Той, хто скаліць, паказвае зубы. *От вышчарка, да зуба нема, да шчарбата. Закрый рота, а то нехорашэ.*

ВЭ́ДЛУХ *прысл.* У параўнанні. *Тепэр, вэдлух летошнёго, лето сухэе, сена можна зробіть.*

ВЭ́ЛІК *м.* **1.** Веласіпед. *На вэліку ў Рубэль поеду до девэра.* **2.** *перан.* Дурань. Расказваюць, што колісь жыў у вёсцы яўрэй з такім прозвішчам, і быў ён неразумны. Адсюль паходзіць гэтае слова. *Ото вэлік бажыть, утекайте, деті.*

ВЭРЧ *м.* Скрутак лазовай кары для пляцення лапцей. *Варчэ робілі на постолы.*

ВЭ́ТЛА *ж.* Від вярбы. *Вэтла лёгко колецца.*

Г

ГАВЭ́НДАТЬ *незак.* Гаварыць. *А шчо-то зайшла й не загавэндала!? Мо засерділас?*

ГА́ЛАС *м.* Акопнік лекавы. *Галас на нізох росте, его добрэ свіням, едять вэльма.*

ГАЛУ́ШКІ *мн.* Клёцкі. *Я галушкі вэльма любіла, ек мала была.*

ГА́ЛЬКА *ж.* Начная сарочка. *Шчэ ў мане галька девоцкая лежыть.*

ГА́МАТЬ *незак.* Есці (*у размове з дзецьмі*). *Гамай чучу, да валікі выростеш.*

ГА́МУЗОМ *прысл.* Усім разам, гурбай. *Шчодрэчнікі гамузом у хату ўваліліс.*

ГВОЗД *м.* Вялікі цвік. *Я гвоздом добрым жэрдіну прыбіў, не одорвэцца.*

ГВОЗДО́К *м.* Цвік. *Гвоздок бы алюміневы, гнецца во ўсе бокі.*

ГЖЭ́ЧНЫ *прым.* Спраўны, прыгожы, культурны. *От хлопчэня гжэчнэ да хорошэ.*

ГІДІ́ЦЦА Гідавацца. *А малэ шчо, вонэ ж не гідіцца, за тэ паскудство да ў рот.*

ГІЧ *м.* Бацвінне. *Я кабану гіч з буракоў рву да даю.*

ГІЧ'Е́ *н.* Бацвінне. *У бураках гіч'е.*

ГІШЭ́ФТ *м.* Справа, адносіны. *Я з ім зарэз ніякого гішэфту не ваду.*

ГЛЕ́ЧЫК *м.* Збан. *Шчарбаты глечык з молоком стоіть, вонэ кіслэ.*

ГНЕНУ́ТЬ *зак., экспр.* Моцна ўдарыць. *От гнену зарэ, ек будеш бушовать.*

ГО́ДІ *прысл.* Хопіць, даволі. *Хлопцы, годі ўжэ бушовать!*

ГОЙНЁВАТЬ *незак.* Быць у стане цечкі (пра авечак, сабак). *Ек гойнюе сука, то собакі розорвать могуть.*

ГО́ЛКА *ж.* Іголка. *Голка была копейка, а тэпэр мо сто рублей.*

ГОЛОШЧО́К *м.* Зямля, замёрзлая без снегу. *На дворэ такі голошчок, а вон кажэ саньмі ехать.*

ГОРА́ *ж.* Гарышча *У нас на горэ свет е.*

ГОРАЛЕ́Я *ж.*, **З ГОРАЛЕ́Ю** З вялікім верхам. *Скопца насыпаў з горалею.*

ГОРПА́ *ж.* Свірэпа. *Горпой заросло ўсе ў огороді, а вона ні шманае.*

ГОРЧА́К *м.* Драсён птушыны. *Вон бы пэрэц пакучы, той горчак.*

ГО́СТРЫ *прым.* Востры. *Нож гостры, не порэж пальца.*

ГО́ЦАТЬ *незак.* Моцна стукаць абцасамі. *От гоцала на веселлі, да ўпрыседы ўсе.*

ГРА *ж.* Гульня. *Гра не доваде до добра.*

ГРАБЁНКА *ж.* Прылада для збірання ягад. *Грабёнкамі ягоднік нішчыцца.*

ГРУМЕ́ЧАТЬ *незак.* Грэбаваць. *Мо ты грумечаеш моім порадком?*

ГУЗЫР *м.* **1.** Камель. *Дрова гузырамі ўпэрад ложать.* **2.** Пухліна. *На лбу гузыр выскочыў, ек вальнуўса.*

ГУ́НУЦЦА *экспр.* Моцна ўдарыцца пры падзенні. *Падаў на лёду да ек гунуўса.*

ГУ́ТОРКА *ж.* Доўгая, пустая размова. *Вы по делу говорэте, а то завалі гуторку.*

ГЭ́БЭЛ *м.* Гэблік. *Гэбэл стружкамі забіваецца нешчо.*

ГЭ́НДЭЛЬ *м.* Сумніўная справа. *Это гэндэль абыекі, не вер ему.*

ГЭ́СТКА *ж.* Дэталь кофты, сарочкі. *Гэстка – гэто напэрадзі, на грудях ушывалас устаўка такая.*

Д

ДА́ЙЖЭ *часц.* Нават. *Вон чотэры класы кончыў, а дайжэ пісать не ўмее.*

ДЕВУ́ЛЯ *ж., зневаж.* Дзяўчынка. *Така девуля, а вона плачэ баз матеры.*

ДЕ́ВЭР *м.* Мужаў брат. *Учора девэр мой прыходіў, хочэ, шоб Міша з ім ехаў на вэсну.*

ДЕ́ЖКА *ж.* Дзяжа. *Колісь дежка ў кажной хаті была.*

ДЕ́ЛО *н.* Справа. *Твое дело – езыком ляпать абы-шчо.*

ДЕ́РАВО *н.* Дрэва. *За ўсю жысть не посадіў дерава, шчытай, бас толку жыў.*

ДЕРАВЯ́НКА *ж.* Птарміка храшчаватая – расліна з цвёрдым сцяблом; другая мясцовая назва – "рэбрэй". *Деравянку косіш то косу ўладіш.*

ДЕРАВЯ́НЫ *прым.* Драўляны. *Деравяна ложка рота не опекае, трэб купіть у Малгосіка.*

ДЕРАШОВА́НЫ, ДЕРАШОВА́ТЫ *прым.* Масць жывёлаў, звычайна коней. *У Маркуцкого конь тоўды быў некі дерашованы, Чурык купіў его потом.*

ДЕ́ЎКА *ж.* Дзяўчына. *Девок у Ольпэні нема, а хлопцоў морэ.*

ДРАБІ́НА *ж.* Лесвіца. *Зробіў учора драбіну на вышкі, стара поламалас.*

ДРУК *м.* Кій, палка. *Змі друка короў пасті.*

ДУБ *м.* Лодка. *Нема ўжэ воды, то і дубы не трэба, погнілі во ўсех.*

ДУБЭЛЬТО́ВЫ *прым.* Дыхтоўны, вельмі добры. *Мого зятя дача ой дубэльтова, ой хороша!*

ДУПЛО́ *н.* **1.** Пустата ў ствале дрэва. *Дятел у дупло полез.* **2.** Адтуліна, дзірачка ў зубе. *У зубі, набіть, дупло ў мане естя.* **3.** *экспр.* Ягадзіца. *Баба шо бочка, дупло будь здороў, а вон сам усе робіть.*

ДУСТ *м.* **1.** Дробны парашок, пыл, попел. *У цагэльні ў пачэ дуст тачкамі вывозять.* **2.** Ядавіты парашок для знішчэння насякомых. *Колісь дустом травілі жукоў каларацкіх.*

ДЬВЭ́РЫ *мн.* Дзверы. *Настеж открый дьвэры, хай дым выйде.*

ДЫХТ *м.* Дыктоўка, указ. *Вон усе по ее дыхту робіть, нема свого розуму.*

ДЭ́ЙКА *ж.* Чутка. *Е дэйка, шо то вон у Ізраілі зарэз.*

ДЯ́ННА *ж.* Дзядзькава жонка. *Моя дянна з Валяміч, валямічанка вона.*

Дж

ДЖУ́ПЛАХА ДАТЬ Адлупцаваць. *От дам джуплаха, ек не послухаеш.*

ДЖЫГАНУ́ТЬ *зак.* Уджаліць. *Пчола джыганула, да око ўсе закрылос.*

ДЖЫГУ́Н *м.* Фарсун. *Шчэ малы, а ўжэ такі джыгун, у люстро, шчо деўка, зазірае.*

Е

ЁЖЫК *м.* Вожык. *Ежыка цыгане едять, наліхо ім.*

ЕК *часц.* Як. *Ек бачыш, збегаў у магазін.*

ЕРЎГА *ж.* Яр, глыбокая яма. *От еругу вода выкотловала, бач.*

ЁСКОЛІЦЦА *незак.* Займаць адзін аднаго, чапаць. *Деті, не ескольтеса, седете спокойно.*

ЕТРО́ЎКА *ж.* Братава жонка. *Моя етроўка молода, а ўся сіва ўжэ.*

Ж

ЖА́БОР *м.* Забруджаная стаячая вада. *Ноч ногі ад жабору часаў.*

ЖАЛЯ́СКО *н.* Прас. *Шчэ ў мане е жаляско, шчо выголлем запраўлялі да палілі.*

ЖАХА́ЦЦА *незак.* Пужацца. *Нажахаласа ў той аварыі, да ноч не спала.*

ЖЛЎКТО *н.* **1.** Выдзеўбаная з драўлянай калоды пасудзіна для запарвання бялізны. *У жлукті одежу золілі коліся, попал да вода гарача да ў жлукто да гэ о, бач, так мылі.* **2.** *перан.* Пра таго, хто многа п'е спіртнога. *Набралосо жлукто, да лежыть ужэ.*

ЖОЛУПА́ТЬ *незак.* Прагна, паспешліва есці, глытаць *(звычайна пра птушак)*. *От вутвы жолупають комбікорм!*

ЖО́РОСТЬ *ж.* Доўгая жэрдка, доўгі ствол дрэва без галля. *От жорость, на граматвода добра.*

ЖУПА́Н *м.* Верхняе адзенне, паліто. *Раньшэ ўсе жупан казалі, это зарэ ўжэ паліто сталі казать.*

ЖЫД *м.* Яўрэй. *До войны ў Ольпэні жыдоў ой маса было! Немцы іх, небурак, усех уладілі.*

ЖЫ́ЖА *ж.* Агонь *(у размове з дзецьмі)*. *Не чапай жыжу, а то буде вава.*

ЖЭ́ЎЛЕТЬ *незак.* Тлець. *Торф жэўлеў-жэўлеў ды й загорэўс-такі.*

З

ЗА́ЕДЬ *ж.* Гнус, машкара. *У той год ад заеді худоба дохла.*

ЗАКА́ЛЕЦ *м.* Сыры, недапечаны слой у хлебе каля ніжняй скарынкі. *У ее хлеб вечно з закальцэм, а вона мане вучыць!*

ЗАЛО́ІТЬ *зак.* Зашмальцаваць. *Рубашку залоіў, еле домыласа.*

ЗАПО́Л *м.* Прыпол, ніжні пярэдні край сукенкі, кашулі і пад. *Поўны запол грыбоў, бач, набрала, пока корову загнала.*

ЗАРЭ́ЙДАЦЬ *зак.* Запэцкаць, вымазаць. *Неді штаны зарэйдаў у коломазь.*

ЗАСЕ́КТІ *зак.* Засякчы. *Трэб тепэр пеўня засекті, годі вон біўся.*

ЗАСТОРО́НОК *м.* Месца для сена ў хляве. *Застороонок порожні зарэз, а васна далеко.*

ЗАТО́ЎКА *ж.* Унутранае сала. *Коліся затоўку скачвалі ў такіе бы рулеты да солілі.*

ЗЕЛЕНЕ́Ц *м.* Малы шчупак. *Ек збоўталі ту копанку, то зеленцэ радамі ішлі.*

ЗОЛІ́ТЬ *зак.* Вымочваць адзенне ў адвары з попелу. *Зарэ мыла да стірального порошку не докупісса, то мо зноў золіть будом одежу, шчэ ж не забыліса.*

ЗЮ́ЗЯ *ж.* Холад *(у размове з дзецьмі). Зюзя на дворэ, Пэтрык.*

І

І́ДОЛ *м.* Ідал *(часцей за ўсё выкарыстоўваецца як лаянкавае). Іді спать, ідол ты, шкоднік.*

І́МАЛЬ (І́МЭЛЬ) *ж.* Балотная расліна, добры корм жывёлё зімой. *Коб пойшоў да імалі нажаў, мо высохла б.*

І́МПАТ *м.* Нейкая сіла, дух. *Да гром ек ляснуў кала мане, то мане імпатом откінуло на землю, а корова, ек я очомаўся, лежала нежыва.*

І́РОД *м., лаянк.* Ірад. *От, ірод, от угрыз душу.*

К

КАГА́ЛО *н.* Род, племя. *У іхнём кагалі ўсе такіе, бы ты не знаеш – зімою снегу не достанеш.*

КА́КА *ж.* Штосьці бруднае, брыдкае *(у размове з дзецьмі). Не чапай, гэто кака, кінь тютю лепш.*

КАЛІ́ТА *ж.* Палявая сумка. *Каліту леснік носіть, мо там еда ека, мо бумагі.*

КАЛЮ́ГА *ж.* Лужына. *Унь малы ў калюгу ўпаў.*

КАПЛІ́ЦА *ж.* Невялікі царкоўны будынак. *У нас была капліца пры Польшчы, туды ўніяты ходілі, а Советы клуба з ее зробілі, наліхо ім.*

КАПШЎК *м.* Мачавы пухір у свіней. *Капшука м'ялі з попалом, да надоўвалі, да сушылі да детям забаўка была. А то шчэ его мылі добрэ, да чыстым салом залівалі.*

КАРАЧЎН *м.* Клышаногі. *Карачун гэто нога об ногу терэ.*

КАРАЧЎХА *жс.* Клышаногая. *Гэля пошла, карачуха.*

КВА́РТА *жс.* Металічная пасудзіна з ручкай, з якой п'юць ваду, конаўка. *Кварту воды выпіў, а молоко покінуў.*

КВАЧ *м.* Пэндзаль. *Быў квач да засох у красцы.*

КЕ́ПАЛО *н.* Дурная голова. *От кепало, по хлеб пошоў да сумку забыў.*

КІ́ЛЁ *н.* Кілаграм. *Кілё цукру нема шчо бачыть, а гэто жс на месец.*

КІНО́ЎШЧЫК *м.* Кінамеханік. *Коліся Вася Пуп кіноўшчыком быў.*

КІРДЎПЭЛЬ *м.* Малы ростам, кволы чалавек. *Не чоловек, а так, некі кірдупэль, заморок.*

КЛЁЦ *м.* Вялікая, цяжкая груда гліны. *Бало, у цагэльні клёцы поповарнуў.*

КЛЕНДАТЫ *прым.* Клышаногі. *Колісь Віктёр клендаты быў.*

КО́ВАНІК *м.* Спецыяльна акаваны кіёк для пераходу праз лёд. *Я с кованіком смело по Горыні іду, а так страшно, можсэш проваліцца.*

КО́ЖА МЕ́ХОМ *прысл.* Неадкладна. *Тётка прыходіла, казала, шчоб ты кожа мехом тепэр прыйшла до іх.*

КО́ЖМАН *м., экспр.* Вялікі шчупак. *От кожмана поймаў у копанцы.*

КОЖЎШОК *м.* Шчупак. *Кожушок – смачна рыбіна.*

КО́ЛЕНШЧЫНА *ж.* Мадэпалам – від тканіны. *С коленшчыны я старому нашыла сорочок, то шчэ й зарэз естя.*

КОЛЕСНІ́К *м.* Невялікі воз. *У Забарэззі колеснік сена накосіў.*

КОЛО́МАЗЬ *ж.* Каламазь, калёсная мазь з дзёгцю, смалы і солі. *Колісь до воза подвешвалі вадерцэ с коломаззю да і возілі с собою.*

КОПАНІ́ЦА *ж.* Лопата. *Хрэн копала да копаніцу погнула.*

КОСТЕРЭ́ВА *ж.* Брыца, плашчуга. *Вэльма костерэвой бульба ў мане заростае, нема рады.*

КОЦУБА́ *ж.* Кавенька, кій для апоры пры хадзьбе. *Дед коцубою на курэй кінуў, то воны побеглі з огорода.*

КОШТОВА́ТЬ *незак.* Спрабаваць на моц яйкі. *Яйца вон умее вэльма коштовать, ек выбарэ моцака на Валіконне, то ўсем параб'е.*

КРАГЭ́ЛЬ *м.* Здаравяка. *Мой батько крагэль быў, шчэ й зарэз жыў бы мо, коб не ўбілі немцы.*

КРЭ́ЙДА *ж.* **1.** Кавалак мелу, які ўжываецца да пісьма. *У школі крэйдою пішуть на дошцы.* **2.** Мел для пабелкі. *У Городку іншы раз крэйду продають, у грудках такіх.*

КУБЛО́ *н.* Гняздо. *Яйца забрала, а поклада оставіла ў кубле.*

КУЛЁВІК *м.* Невялікі мяшок. *Забыласа ўзять кулёвік.*

КУ́МАЛЕМ *прысл.* Вельмі хутка, кулём. *Хлопэц скучыў баз матеры да кумалем до ее, ек побачыў, шо прыехала.*

КУХА́ЙКА *ж.* Целагрэйка. *Колісь шэсть рублей кухайка стоіла.*

КЎХЛІК *м.* Невялікая конаўка. *Мамо, Діма кухліка розбіў. Ты набі его!*

КЎХОР *м.* Куфар, вялікая скрынка з векам для захоўвання тканіны, адзення, каштоўнасцяў. *Ек была эвакуацыя, то я кухра закопала парад хатою, а нехто ўсе выбраў, нагледеў.*

КУХЭ́РОК *м.* Невялікі куфар. *У кухэрку держала оддельно парапой.*

КУЧО́МКА *ж.* Зімовая шапка з аўчыны. *Тепэр кучомок нема з оўчыны, не шыють.*

Л

ЛА́НТУХ *м.* **1.** Рваная адзежына. *Не одевай того лантуха, кала хаты ў ём будеш.* **2.** Неахайна апрануты чалавек. *Некі пошоў чоловек лантух, мо старэц некі.*

ЛАПЎЗА *м. і ж.* Няўклюда. *Утекай, лапуза, ты ўжэ і так побіў усю посуду.*

ЛЕ́ДЬВА *прысл.* Ледзь. *Ледьва прытеглас с села, ногі болять гэ.*

ЛЕКОТЕ́ТЬ *незак.* Трэсціся ад страху, марозу. *От лекотела я, ек побачыла, шчо немэц до нас заварнуў.*

ЛЕ́КТРА *ж.* Электрычнасць. *Лектра ў Ольпэні ўжэ мо годоў трыццэть е.*

ЛЕПЭ́ТА *ж.* Вадкая гразь. *На дворэ лепэта – не вылезті.*

ЛЕШЧО́ТКА *ж.* Шына для змацавання ў нерухомым стане. *Бусько ногу зламаў, а мы ее ў лешчоткі ўзелі, да зрослас!*

ЛЕ́Я *ж.* Вялікі лапік, што нашываецца на вопратку (на калені, на сядзенне). *Я лею на колено з сукна прышыла.*

ЛЁХ *м.* Склеп, пограб. *У мане ў лёсі бульба помэрзла.*

ЛІГУМІ́Н *м.* Ласунак. *Лігумін – гэто шчо-небудь смачнэ.*

ЛІ́ПЭЦ *м.* Ліпкі гной. *Гной такі ліпэц овэчы, не можна зорвать.*

ЛІСОПЭ́Д *м.* Веласіпед. *У лісопэді нешчо трашчыть, да пропускае, ек едеш.*

ЛО́БУЗ *м.* Гарбузовы ліст, наогул уся зялёная маса гарбуза. *Трэб начынать лобуз стягвать да чыстіть бульбу.*

ЛОМЭ́Ц *м.* Пажаданне нядобрага, ад словаў "ламаць", "ламота", "ломка". *Шчоб на тебэ ломэц напаў, ты ж выдумала ўсе.*

ЛУ́ПАС *м.* Лупцоўка. *Ну, ольшанец, получыш ты ў мане тепэр лупаса.*

ЛУ́ЧЧЭЙ *прысл.* Лепш. *У гостях добрэ, а ўдома луччэй.*

ЛЮ́СТРО *н.* Люстэрка. *Люстро стало некэ нечыстэ, мутнэ.*

ЛЯ́СТКА *ж.* Невялікая тонкая дошчачка. *Хлопцы з некіх лясток собе мечэ поробілі да бегають по вуліцы, галёкають.*

М

МА́ГЕР НА МАГЕР Насіць набок шапку. *Вон зроду ходіть шапку на магер.*

МАГЛЁВА́ТЬ *незак.* Штукарыць, рабіць штонебудзь паволі і якасна. *Ек вона градку маглюе, то мане блёвать вэрне, так корпаецца.*

МАДЬВЕ́ДЬ *м.* Мядзведзь. *Мой дед казаў, шчо ў нашом лесі мадьведі былі.*

МА́ЙКА ПО́РЭ Больш-менш добра. *У тебэ майка порэ бульба, а ў мане горох некі самы.*

МАКО́ТРА *ж.* **1.** Від ганчарнага посуду. *З Городной прывазлі горшкі, макотры.* **2.** *абразл.* Галава. *Ну ў тебэ й макотра, ніяка шапка не лезе.*

МАЛЁЎШЧЫК *м.* Каляровы аловак. *Нашчо тобе краскі, малёўшчыкамі нарысуй.*

МАТУ́СЯ *ж.* Хросная маці. *Моя матуся ў Лісовічах жывэ.*

МАХА́Й МА́ХАЛОМ Пішы прапала. *Цыганцы позычыла, то махай махалом.*

МА́ЧУХА *ж.* Мачыха. *Я пры мачусі годовалас.*

МАШО́К *м.* Мяшок. *Коліся ўзела машок цукру, да шчэ тягнецца.*

МІРЭ́Ц *м.* Мярцвяк, нябожчык. *Я до іх у хату, а там мірэц на покуті лежыть, а я ж не знала.*

МІШУ́ГІН *м.* Дурань. Расказваюць, што жыў колісь нейкі дурнаваты чалавек у вёсцы па прозвішчы Мішугін, адсюль паходжанне гэтага слова. *Утекай, мішугін, унь людi смаюцца, а ты скачэш.*

МЛІНЕ́Ц *м.* Блін. *Я ў ніделю заўсёды млінцэ паку.*

МО́ГЛІЦА *ж.* Могілкі. *Ніхто не знае, шчо-то ў Ольпэні двое могліц.*

МО́РДА *ж.* Шчака. *Да одморозіла морду, да снегом натірала.*

МОРКА́Ч *м.* Баран пасля кастрацыі. *От моркача ўнё рогі закручаные.*

МОЦЫКЛЕ́Т *м.* Матацыкл. *З моцыклетом у канаву з'ехаў.*

МОЧ *ж.* Мача. *Моч добрэ помогае, ек порэжэш шчо чы ека ваўка.*

МОШНА́ *ж.* Машонка. *Собака бугаю мошну порваў да мусілі рэзать.*

МЫ́ЧКА *ж.* Расчасаная на грэбень і згорнутая ў скрутак жменя льну. *А потом гэтые мычкі прадом.*

МЭД *м.* Мёд. *Мэд ніколі не портіцца.*

МЭ́СТОМ *прысл.* Быццам. *Я мэстом пішу, нагнуўса, шоб обмануть іх.*

МЭ́ТЭР *м.* Кубічны метр, цэнтнер. *С калхоза мэтэр дроў прывазлі да й шчо хоч робі зіму.*

Н

НА́БІТЬ *прысл.* Мабыць. *Набіть, дошч пойде наноч.*

НАВЭРТІ́СА *зак.* Намагчыся, моцна захацець. *А вон навёрса толькі коня купіть, дый годі.*

НАВЭРЭ́ДІТЬ *зак.* Натрудзіць, намучыць. *Ногу больную навэрэдіў, да ноч не спаў, так болела.*

НАДЕ́ЖНІЦА *ж.* Накрыўка з тканіны для дзежкі. *Дежка ў вуглу і надежніца на ёй.*

НАЛЕ́ІТЬ *зак.* Падшыць лею, вялікі лапік. *Мой Патро сам собе штаны налеіть.*

НАЛІ́СНІК *м.* Тонкі блін з рэдкага цеста. *Нечого ў будні день налісніки пакті буду, выдумаўса.*

НАЛІХО *прысл.* **1.** Нашто, для якой патрэбы. *Ежыка цыгане едять, наліхо ім.* **2.** На няшчасце, назло. *Шчоб тобе наліхо да тобе напусто, дурэнь ты!*

НАСТАЎНЯ́ *ж.* Прылада для лоўлі рыбы. *Е така настаўня, а ека вона, то я не знаю.*

НАСТЎРЧЫК *м.* Кветка настурцыя. *Настурчыкі вэльмі хорашэ цвітуть кала школы.*

НЕБУРА́ЧНЫ *прым.* Небарака. *Остаўса, небурачны, як стоіть.*

НЕГОДЯ́ШЧЫ *прым.* Нягодны, слабы. *Мой стары зоўсем негодяшчы стаў.*

НЕДО́ШЛЫ *прым.* Слабы, фізічна мала развіты. *Купіла поросят пару, дьвесті тысеч оддала, а воны недошлые некіе.*

НЕ́КІ *займ.* Нейкі. *Некі чоловек пошоў з коцубою.*

НЕ́КОШ *м.* Непрыгодны для касьбы участак. *У Забарэззі век некош, сосонка, рэбрэй.*

НЕ́КЭ *займ.* Нейкае. *Ейцэ некэ завалялос шчэ.*

НЕХОРЭ́МНЫ *прым.* Вельмі непрыгожы. *У ее сын одін нішчо, а другі такі нехорэмны, страх.*

НЕ́ШЧО *займ.* Нешта. *Нешчо мне муляе ў чоботі, мо нуча ссунулас.*

НІЗЫ́СТЭР *прысл.* Быць вельмі падобным. *Дочка нізыстэр маті, добрэнная ўдалас.*

НОСТРА́МОК *м.* Невялікі воз сена. *У калхозі получыў цэлы нострамок, выкормім.*

НО́СЦА ДАТЬ Даць выспятка. *Білі носцамі по чом попало небураку.*

НЎЧА *ж.*Ануча. *Добра нуча да постолы, да ногам любота, бало.*

О

ОБЭ́РТУХ *м.* Легкадумны, шустры. *Не будь ты обэртухом, думай, шчо робіш.*

ОГЛОБЭ́ЛЬНІК *м.* Той, хто цяжка працуе, "запрагаецца ў оглоблі". *Оглобэльніку луччы кусок м'яса давалі, а не детям.*

ОКОШЫ́ЦЦА Засцерагальны выраз. *Хай вонэ на гэтом і окошыцца, то шчэ слава Богу.*

ОЛЬПЕ́НЕЦ *м.* Альпенец, жыхар в. Альпень. *Ольпенца я по мові ўсюды познаю.*

ОСТРАБО́К *м.* Ястрабок. *Острабок курэнят похапае, трэба ў хлеў загнать.*

ОТРАБЯ́НКА *ж.* Каўбаса з вантробаў. *Я отрабянку люблю, ек мало пачонкі ў ёй.*

ОЎТО́РОК *м.* Аўторак. *У оўторок выходны ў мого хлопца.*

П

ПАЗУ́Р *м.* Ногаць. *Пыд пазурамі гразь, а вона красіть іх.*

ПАЛЮ́ТКА *ж.* Палавінка гарбуза. *Выбрала тры палюткі, у чыгун зложсыла.*

ПА́НЧЭРЫЦА *ж.* Падчарка. *Я годовалас баз матеры, панчэрыцою была.*

ПА́ПА *ж.* Хлеб *(у размове з дзецьмі)*. *Еш папу з молочком, сыночок, гамай.*

ПАРА́Д Перад. *Парад постом буде.*

ПАРАПО́Й *м.* Вясельны падарунак. *Я ек матуся мушу на парапой мільён положыть.*

ПІ́ПА *ж.* Вада *(у размове з малымі дзецьмі)*. *Не ідi ў піпу, сынок, намочыш ножкі.*

ПЛЕШНІ́К *м.* Аер. *На Тройцу плешнік стелють усюды.*

ПОЛЁВАТЬ *незак.* Быць у стане цечкі *(пра кароў)*. *Набіть, моя корова полює, нешчо вэльма рыкае.*

ПОСТО́Л *м.* Лапаць. *Постолы ў мане на горышчы шчэ валяюцца.*

ПО́ТЯЗЬ *ж.* Прасніца для воўны. *Потязь естя ў бабы Зоркі шчэ, я бачыла.*

ПО́ХВАТ *м.* Раптоўны парыў ветру. *Похват ішоў, да стожка ростерушыло ўсёго.*

ПУХЛЯ́К *м.* Ужываецца пры сварцы. *Шчоб тебэ пухляк узяў!*

ПЫ́ДЛЕТОК *м.* **1.** Падлетак. *Ек хлопэц шчэ не дорослы, але ўжэ й не дітя, то пыдлеток, от до годоў семнаццаті.* **2.** Птушаня, якое вучыцца лётаць. *Ластоўчэнята ўжэ пыдлеткі.*

ПЫ́ДМАЗКА *ж.* Падмазка. *Я пыдмазку твою коту оддала.*

ПЭ́РВЫ *ліч.* Першы. *Пэрвы раз такэ тепло.*

ПЭ́РГАЛО *н.* Той, хто робіць справу вельмі павольна, корпаючыся. *Не маглюй, пэргало, нема шоб раз-два і готово.*

ПЭ́ЦАЛЬ *м.* Зневажальная назва, зварот. *Ты протіў мане пэцаль, моўчы хоть.*

ПЭ́ЦКАЛО *н.* Той, хто робіць што-небудзь брудна, неахайна. *Не воруш, я сама, ты некэ пэцкало, а не роботнік.*

Р

РА́ДІВО *н.* Радыё. *За радіво грошы з пенсії одварнула почтальёнка.*

РАМАТІ́З *м.* Рэўматызм. *Од гэтой гумы раматізом заболееш шчэ.*

РАПЭ́НЯ *ж.* Жаба-рапуха. *От я тых рапэней гіджуса.*

РАХУ́БА *ж.* Вынік, падлік. *Тут проста рахуба – кілё мукі за літэр.*

РАШАМЭ́ТА *ж.* Прылада для зімняй лоўлі рыбы. *На полонкі ставілі рашамэту, да вэльма в'юны ішлі, бало.*

РО́ВАР *м.* Веласіпед. *У Городок мо коб роварэм з'ездіў.*

РОЗДВО́ *н.* Раство, Божае Нараджэнне *На Роздво морозу ніяк не было, одліга, с стрэх капало.*

РОЗБІРА́ЦЦА *незак.* Распранацца. *Пора тобе, Коля, розбірацца да ложыцца спать, деў'еть часоў зарэ.*

РОЛЛЯ́ *ж.* Ралля. *Парасохла ролля, дождж гвалт трэба.*

РОПА́ *ж.* **1.** Моцны раствор солі. *У ропе стёгна вымочвають.* **2.** Выдзяленні з роту нябожчыка. *У мірца ропа з рота, бывае, іде.*

РОСЧАХНУ́ТЬ *зак., экспр.* Разарваць. *Я за тые брэхні росчахну ее.*

РО́ХЛЯ *м.* Бесхарактарны, падатлівы чалавек. *А вон там хазяін? Так, нека рохля, Паўка командуе ўсем.*

РУБЭ́ЛЬ *м.* **1.** Рубель – грашовая адзінка. *Тепэр за рубля одна спічка выходіть.* **2.** Рубель – жардзіна для ўціскання сена на возе. *Увязвалі сено, да рубэль поломаў-*

са. **3.** Рубель – вёска ў Столінскім раёне. *Тепэр у Рубле нешчо горэло.*

РЫ́ХТІК *прысл.* Якраз, дакладна, вельмі падобна. *Быцочка отеліла рыхтік бы летося, рабэнького.*

РЭБРЭ́Й *м.* Птарміка хрышчаватая – лугавая расліна з цвёрдым сцяблом; іншая мясцовая назва "дераўянка". *Рэбрэй косіть – то косу ўладіш і сам уладісса.*

РЭЧЭНЕ́Ц *м.* Канец. *На гэтом, свахо, рэчэнец. Договорыліс.*

РЭ́ШТА *ж.* Тое, што засталося. *Жонко, ты рэшту забыласа ўзять.*

С

САЛІ́НА *ж.* Кусочак сала. *Е саліна да хлебіна, то шчэ не бада.*

САМОТУ́ЖКІ *зб.* Невялікія сані. *Бало, самотужкамі дрова попотягалі.*

САМОШЭ́ЧЧЫ *м.* Вар'ят. *Кірылко ек п'яны, то самошэччы.*

САРА́ТА *ж.* Цырата. *Я сарату на почті купіла, там дешавей.*

СВЭ́ДЭР *м.* Світэр. *У цыганкі свэдра купіў.*

СВЭ́РДЁЛ *м.* Свярдзёлак. *Некому свэрдёла оддаў, да не помню.*

СЕДРО́ *ж., абразл.* Мянушка чалавека, шырокага ў касцях, з вялікай тазавай часткай. *Седро зноў на полі, бач.*

СЕРАЎНО́ *прысл.* Ус̄ё роўна. *Кажы ему, не кажы, вон сераўно свое право правіть.*

СЕ́РКА *ж.* **1.** Малодзіва. *Шчэ молоко серкою оддае.* **2.** Абмазка запалак. *Колісь запалку разом з серкою на две часті кололі.*

СІ́КЭЛЬ *м.* П'яніца. *Мой сікэль поўзе п'яны.*

СКАДА́ВЭЦ *м.* Клінок для адціскання сыру, тварагу. *Мо коб з мэрлі скадаўца пошыть?*

СКАНДАЛА́ *ж.* Невялікая колькасць, частка; зусім мала. *За той месец добавілі неку скандалу до пенсії.*

СКО́ЛОК *м.* **1.** Асколак. *Стекло на дробные сколкі розбілос.* **2.** Дурань, недарэка. *Ты сколок, шо ты наробіў, га?*

СКОПЭ́Ц *м.* Капец. *Мой стары ўжэ скопца гноем обложыў.*

СКРЭ́ДОМА *прысл.* Пайсці невядома куды, загінуць. *Поехаў Пашкевіч да й пропаў скрэдома.*

СКУНДЯ́БІЦЦА *зак.* Згорбіцца, сціснуцца. *От скундябіўса, бы немавэсті екі мороз.*

СМАЗАНУ́ТЬ *зак., экспр.* Моцна ўдарыць. *А той не вытерпеў, да ек смазануў ему по морді.*

СМАТА́НА *ж.* Смятана. *Нека горка сматана, гэто парад теленнем ужэ.*

СМАХОЎЕ́ *н.* Смехаўе. *От тобе і ольпенскэ смахоўе.*

СОКЕ́РА *ж.* Сякера *Я сокеру наточыў у кузні ў Пэнчыка.*

СОПЛІ́ВЭЦ *м.* **1.** Від рыбы, пакрытай сліззю. *У Горыні под прымолом кала Стасіхі сопліўцы вудяцца.* **2.** *пагард.* Нявопытны чалавек, які мала ведае жыццё; малакасос. *Такі соплівэц вучыть мане!*

СПЛЕ́ННЕ *н.* Успенне. *Нашу цэркоў колісь на Спленне осветілі.*

СПОНІ́ЦА *ж.* Спадніца. *Споніца цветаста не для старой жонкі.*

СТА́РЭЦ *м.* Жабрак. *Колісь, помню, старцэ да старчанкі бас конца ходілі по хатох.*

СТАРЧА́НКА *ж.* Жабрачка. *После войны старчанок было багато.*

СТЕГНО́ *н.* Бядро. *Штаны ўнь порваў да стегно бачно.*

СТЕ́ЖАРОК *м.* Адонак – подсціл з галля, жэрдак, на які кладуць стог; стажар'е. *Тепэр у колхозі сено, шчытай, баз стежарка кладуть у стожок.*

СТО́ЎБ *м.* Слуп. *Кала цэрквы ветёр стоўба выварнуў.*

СТЭМП *м.* Туалет. Ад польскага "ўстэмп". *Полякі застаўлялі, шчоб стэмп быў у кожного хазяіна.*

СУ́ТКІ *зб.* **1.** Адзінка вымярэньня часу. *За суткі ў Пінск і назад ворочаўса дед той.* **2.** Прастора паміж дзьвума блізка размешчанымі пабудовамі. *Свіня ў сутках усе парарыла, халера.*

СЦУ́ЛЯ *прысл.* Адсюль. *Вадім сцуля пошоў до клуба.*

СЫРО́ЎКА *ж.* Неабпаленая цэгла. *Грубкі з сыроўкі робілі.*

Т

ТА́ЛОВАТЬ *незак., экспр.* Знішчаць. *Уворваліса ўчора калхозные телушкі ў огород, да ўсе ўталовалі. А пастух п'яны!*

ТА́МАКА *прысл.* Тое ж, што і там. *Я тамака, у том селе, не быў ніколі.*

ТАРАГОНЕ́ТЬ *незак.* Барабаніць, стукаць. *Ужэ тарагоняць возы, на базар рубэльцы едуть.*

ТАРАДА́ЙКА *ж.* Скрынка для ягад. *Тарадайкі робілі з тонкіх дранок такіх.*

ТАТУ́СЬ *м.* Хросны бацька. *Мой татусь умэр даўно.*

ТЕЛЯ́ *н.* Цялё. *Тепэр здалі теля ў Федоры, прымаў Карэйцоў зять зноў.*

ТОВА́Р *м.* Статак. *Мо товар на поўдень тепэр прыжануть?*

ТО́ЧКА *ж.* Мядзведка. *У мане точкі вэльма шкоду роб'ять у огороді, усе боком кладуть.*

ТРУ́ПАСОК *м.* Труха, пацяруха. *У засторонку самы трупасок, некэ сено паратерлос вэльма.*

ТРУЯ́ *ж.* Труха. *Я трую з сена гусям запарваю.*

ТРЫБЛА́ТЫ *прым.* Шырокі ў касцях, тоўсты, рыхлы. *Корова стара, трыблата наша.*

ТУ́БОЛЕЦ *м.* Мясцовы жыхар. *Ужэ вон тут тубольцэм стаў, даўно ў Ольпэні жывэ.*

ТУСК *м.* Пот, вільгаць. *Бач, ека гарачка, аж туск з его іде.*

ТЫ́ЖДЖЭНЬ *м.* Тыдзень. *Тыжджэнь тому машок цукру ўзяў у Городку на базары.*

ТЭ́БЭЛЬ *м.* Драўляны гвозд для змацавання бярвенняў у пабудове. *База тэбля хату не зробіш, стена выварнеца.*

ТЭ́ЧКА *ж.* Сумка, партфель. *З тэчкой, бы начальнік, Колюк ходіть.*

У

УЖЭ́ *прысл.* Ужо. *Ужэ світае, а я шчэ не спала.*

УЛА́ДІТЬ *зак., экспр.* Знішчыць, загубіць. *Уладіў часы, майстер найшоўса, ліхо твоей матеры!*

УРО́К *м.* Сурок. *Мо то некіе ўрокі чы шчо, шчо вон так хворэе?*

УРУ́Н *м.* Азімыя пасевы. *Короў на ўруне калхозном пасуть.*

Ф

ФА́ЙНО *прысл.* Добра, хораша. *От файно на тобе гледіцца гэты пінджак.*

ФЭ́НІК *м.* Грашовая адзінка (ад пфенінг). *У хаті ні фэніка нема, усё ў зберкасі.*

Х

ХОРО́МЫ *мн.* Пабудовы. *Его хоромы непродажные, бо спорные, на двох воны.*

ХУ́ДЖЭЙ *прысл.* Горш. *Поба, шчэ худжэй снег пошоў.*

ХУМО́Р *м.* Гумар. Быць не ў хуморы – быць без настрою. *Нешчо ты тепэр не ў хуморы.*

Ц

ЦАГЭ́ЛЬНЯ *ж.* Завод па вырабу цэглы. *Мо на цагэльні магазіна нема зарэз?*

ЦАДЕ́ЛКА *ж.* Цадзілка. *Коб мэрлі на цаделку достать.*

ЦО́ЛДА *ж.* Вялікі кавалак. *Юра Надін таку цолду мяса зараз з'еў, коб вы бачылі!*

ЦУ́РКА *ж.* **1.** Гульня **2.** Драўляная палачка пры гульні ў цуркі. *Гралі ў цуркі, да цуркою воко ему выбіло.*

ЦУРУ́ПАЛОК *м.* Цурбалак. *Змі кія за товарэм, а то ўзяў некого цурупалка.*

ЦЫ́МЭС *м.* Смаката; від ежы (з яўр. мовы). Часта "цымэсам" называюць любую смачную страву. *На дне самы цымэс, сама смакота засталаса.*

ЦЭ́НТЭР *м.* Вялікі цяслярскі свярдзёлак. *Коб цэнтэр да сталюгу зробіть.*

ЦЭ́РКОЎ *ж.* Царква. *Ольпенской цэркві сто з лішнім год.*

Ч

ЧАМПІЁН *м.* Шампіньён. *Шо то ў гэтом году чампіёноў нема?*

ЧАПЛЯЯ́ *ж.* Чапяла. *Мамо,я боюс чапляею скоўроду брать, коб не ўпала.*

ЧО́БОТ *м.* Бот. *Гумовые чоботы некудою текуть.*

ЧОЛОВЕ́К *м.* **1.** Чалавек. *Некі чоловек потягса ў Городок.* **2.** Муж. *Мой чоловек не п'е гарэлку, слава Богу.*

ЧУМАЙДА́Н *м.* Чамадан. *Чумайдана сам зробіў, з фанеры.*

ЧУ́ХРА *ж.* Неахайная, непрыбраная жанчына. *Прышла ў магазін бы чухра ека.*

ЧУ́ЧА *ж.* Мяса *(у размове з дзецьмі). Вася, на чучу, еш, да будеш бы тато.*

Ш

ШВО́РЭНЬ *м.* Шворан – стрыжань у паваротным злучэнні пярэдняй часткі кузава павозкі, які забяспечвае паварoты на хаду. *Для воза швораня ў кузні зробіў Пэнчык Васіль.*

ШВЭ́НДАТЬ Хадзіць без толку. *Не швэндайся туда-сюда, іді за хлебом, мо прывазлі.*

ШМО́ЙЛО *н.* Дрэнна, неахайна апрануты. *Да не іді ў село, бы шмойло, штаны хоть змані.*

ШМЭ́РГАЛО *н.* Той, хто робіць справу неахайна, неакуратна. *От шмэргало, як ты косу поклепаў? Вона ж горш тупая стала.*

ШО́ПА *ж.* Навес, павець. *У шопах у цагэльні сыроўку сушылі.*

ШОСА́ *ж.* Шаша. *У Рубле ўжэ кругом шоса, не то, шо ў Ольпэні.*

ШУЛЯ́К *м.* **1.** Драпежная птушка. *У мане шуляк курчэня ўхопіў учора.* **2.** Дурнаваты чалавек. *Вон шуляк некі, ніяк до вучобы не здатны.*

ШЧОДРОВА́ТЬ *незак.* Шчадраваць, хадзіць па дварах у калядныя вечары, віншаваць гаспадароў, спяваючы калядныя песні. *Діма Данілов ніколі не шчодроваў, мабіть. Вон кажэ – сором.*

ШЧОДРЭ́Ц *м.* Каляды. *Тепэр то на Шчодрэц грошы давай, а колісь сало давалі, мясо, пірога, зернет екіх.*

ШЧОДРЭЧНІК *м.* Каляднік. *До мане шчодрэчнікі ўжэ прыходілі.*

ШЫ́БКА *ж.* Шыба. *У школі тепэр у нашом класі шыбку ўставілі.*

ШЭ́ЛЕГ *м.* Грошы, дробная манета. *У хаті ні шэлега нема, а до пенсіі шчэ далеко.*

ШЭЛЕХТА́ТЬ *незак.* Казытаць. *Шо ты, мо шэлехчэш его, то ж ты его зашэлехчэш!..*

ШЭ́НДЯ *ж.* Малярыя. *Зарэз шэндею не болеють, вывалі ее неяк.*

Ю

ЮРО́К *м.* В'юрок. Прылада для намотвання клубка нітак. *У мане на горэ неді юрок у стрэху е затыканы.*

Я

Я́СІК *м.* Маленькая падушачка. *Я зайшла, а Сережа спіть собе, ясіка под голову положыў.*

Даведачнае выданне

Іван ЛЯШКЕВІЧ

АЛЬПЕНСКІ
ДЫЯЛЕКТНЫ СЛОЎНІК

Адказны за выпуск: Анастасія Ільіна
Рэдактар: Марыя Новік
Карэктура: Святлана Варонік
Тэхнічны рэдактар: Ігар Бараноўскі

Падпісана да друку 20.07.04. Фармат 60х84 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Times New Roman. Рызаграфія.
Ул.-выд. арк. 0,7. Наклад 150 асобнікаў.